Забіваем, калечым і ранім
Без віны, абвяшчэння вайны…
Горка плачуць і коні , і лані,
Толькі нам слёзы іх не відны.

Плачуць сіраты, плачуць удовы,
А забвення няма анідзе.
І пусцеюць азёры, дубровы,
І Чырвоная кніга расце.

Рэжуць цела Прыроды вярыгі,
І куды ні зірні – глум і здзек.
А што будзе праз нейкі там век
Апантаны?......................
У Чырвоную кнігу
Не занёс бы сябе чалавек!

*Міхась Рудкоўскі*

**Рэжым работы:**

**з 10.00 да 18.00**

**Перапынак:** 13.00-14.00
**Нядзеля:** 10.00 - 16.00

**Выхадны дзень:** Панядзелак
**Санітарны дзень** - апошні дзень месяца

*Хоцімская раённая бібліятэчная сетка*
*Бяседавіцкая бібліятэка*
*флоры і фаўны*



# Беражыце першацветы - упрыгожванне планеты!

2015

*Не разрушайце, не тапчыце прыродную красу і гармонію! Не збядняйце каляровую прыродную разнастайнасць!*
*Сарваныя далікатныя, вясновыя кветкі звянуць па дарозе ці праз некалькі сутак у хаце! Засцерагайце вясновыя кветкі!*
*Больш будзе кветак – радасней, паўнакроўней, натхнёней і шчаслівей будзе ваша жыццё!*

Зноў завітала вясна ў наш беларускі край. На светлых лясных палянах расцвітае белы кураслеп, блакітная пералеска, першацвет высокі. Хутка з'явяцца ландышы, сон-трава, пярэсна еўрапейская, званочак шыракалісты. Любавацца гэтымі дзівоснымі кветкамі можна бясконца, але не спяшайся іх рваць ахапкамі.

Сціпла, але прыгожа цвіце чарамша, ці цыбуля мядзвежая.

Чарамша вельмі каштоўная расліна: харчовая, лекавая, меданосная.



У дзікай цыбульцы вітаміну С нашмат больш, чым у лімонах і апельсінах. Шырокае яе лісце нагадвае ландышы, а карэньчыкі нібы прадаўгаватыя цыбулінкі, толькі без лускі.

Расліны ўпрыгожваюць прыроду, ачышчаюць паветра. Іх нектарам кормяцца чмялі, пчолкі, матылькі, яны даюць корм жывёлам. Па віне чалавека на Зямлі знікла шмат раслін. І гэтых прыгожых раслін з кожным днём становіцца ўсё менш.

Каб яны не зніклі зусім, дзяржава ўзяла іх пад сваю ахову. Зрываць гэтыя расліны строга забараняецца, бо яны занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі.

Беражыце прыроду! Мноства лясных раслін можа добра жыць ля чалавека, і таму зусім неабавязкова рваць букеты.

Калі хто-небудзь хоча мець калекцыю раслін, навучыцеся фатаграфаваць. Каляровыя фатаграфіі прынясуць радасць і веды.

Нікому не дазваляйце падпальваць сухую траву на лузе ці абапал дарогі. У агні гінуць многія безабаронныя насякомыя і расліны. Абаронім ад бяздумнага спусташэння нашу цудоўную зямлю!

Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях прадугледжана адказнасць за парушэнне патрабаванняў па ахове і выкарыстанні дзікарослых раслін, уключаных у Чырвоную кнігу Беларусі. Невыкананне дзеючага заканадаўства цягне да накладання штрафу.